ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ

17 верасня – Дзень народнага адзінства. Стар. 3

Знаёмства з першакурснікамі 2021 года. Стар. 6 – 7

15 верасня – Дзень бібліятэк у Беларусі. Стар. 10 – 12

Прадстаўніцы ВДУ – удзельніцы «Міс Беларусь – 2021». Стар. 14 – 15

ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П. М. МАШЭРАВА

DOCENDO DISCIMUS MCMX

# МЫ і ЧАС

№ 8 (367) СЕРАДА, 29 ВЕРАСНЯ 2021 ГОДА

# СВЯТА МАЛАДОСЦІ, ПАЗНАННЯ І НАТХНЕННЯ








Займальныя лекцыі, цікавыя лабараторныя і практычныя заняткі, феерычныя канцэрты... Учарашнія школьнікі, якія зусім нядаўна сталі першакурснікамі, паступова ўключыліся ў бурлівае студэнцкае жыццё нашага ўніверсітэта. Хлопцы і дзяўчаты прымалі ўдзел у «Тыдні першакурсніка»: акцыі «Наперад у будучыню», спартыўным мерапрыемстве «На старт! Увага! Першакурснік!», трэнінгу «Заліковая сесія», інтэлектуальна-забаўляльным квізе і Кубку чэмпіянату каманд КВЗ ВДУ.

«Навінкай» гэтага года стала яркае і пазітыўнае мерапрыемства – «Afterparty для першакурснікаў». Сапраўдная вечарына з дзіджэям праходзіла на стадыёне нашага ўнівесітэта. У гэты вечар кожны прысутны атрымаў зарад драйву і добрага настрою на бліжэйшы семестр.

Фінальным акордам «Тыдня першакурсніка» стала традыцыйнае мерапрыемства «Пасвячэнне ў студэнты».

У гэтыя дні ў актавай зале ВДУ было шматлюдна. Рэктар нашага ўніверсітэта Валянціна Багатырова, доктар эканамічных навук, прафесар, адзначыла, што кожны з прысутных павінен працаваць над маральна-духоўным ростам, шанаваць традыцыі і карыстацца законамі паслушэнства. Менавіта гэтага вектару неабходна прытрымлівацца маладым людзям у дарослым жыцці.

Валянціна Васільеўна перадала сімвалічны «ключ ведаў» студэнтцы факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый Веранiцы Капойцы і студэнтцы юрыдычнага факультэта Паліне Канстанцінавай, якія набралі максімальную колькасць балаў пры паступленні.

Студэнты-першакурснікі спакавалі ў «капсулу часу» напісанае раней пасланне самім сабе ў будучыню, каб праз 4 гады на выпускным вечары даведацца: ці спраўдзіліся іх планы і мары.

Галоўнай падзеяй мерапрыемства стала перадача папяровых жураўлікаў ад старшакурснікаў першакурснікам. Пасля чаго студэнтка юрыдычнага факультэта Паліна Канстанцінава атрымала «граніт навукі» і агучыла «Клятву першакурсніка».

Далей пачалася канцэртная праграма «Сардэчна запрашаем у рытм». Упершыню «Пасвячэнне ў студэнты» праходзіла ў новым фармаце – у выглядзе студэнцкага мюзікла. Так, у першакурснікаў з'явілася цудоўная магчымасць здзейсніць неверагоднае падарожжа ў адукацыйнае, творчае, спартыўнае жыццё ВДУ і адчуць рытм нашай альма-матэр. А таксама зразумець, што кожны дзень у нашым універсітэце – новая старонка гісторыі, якую ствараюць студэнты, каб годна несці ганаровае званне машэраўцаў.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Фота Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

*Фотарэпартаж са свята глядзіце з дапамогай Qr-кода.*